ВАЎКАВЫСКІ РАЁННЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ВОЛКОВЫССКИЙ РАЙОННЫЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

РАШЭННЕ

РЕШЕНИЕ

1 чэрвеня 2026 г. № 367

Аб змяненні рашэння Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта ад 7 кастрычніка 2024 г. № 707

На падставе пункта 4 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 3 "Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва", пунктаў 9, 10 Прыкладнага палажэння аб пастаянна дзеючай камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 сакавіка 2018 г. № 240, пунктаў 9, 10 Палажэння аб пастаянна дзеючай камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва Ваўкавыскага раёна, зацверджанага рашэннем Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта ад 16 сакавіка 2026 г. № 158, і ў сувязі з кадравымі змяненнямі Ваўкавыскі раённы выканаўчы камітэт РАШЫЎ:

Унесці ў рашэнне Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта ад 7 кастрычніка 2024 г. № 707 "Аб пастаянна дзеючай камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва Ваўкавыскага раёна" наступныя змяненні:

у пункце 1 словы "намеснік начальніка – начальнік міліцыі грамадскай бяспекі аддзела ўнутраных спраў Ваўкавыскага райвыканкама" замяніць словамі "першы намеснік начальніка аддзела ўнутраных спраў Ваўкавыскага райвыканкама – начальнік міліцыі грамадскай бяспекі";

уключыць у склад пастаянна дзеючай камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва Ваўкавыскага раёна, створаны гэтым рашэннем, Серага Васіля Мікалаевіча – намесніка старшыні Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта, намеснікам старшыні камісіі, выключыўшы са складу камісіі Т.В.Андрушкевіч.

Старшыня Д.І.Захарчук

Ваўкавыскі раённы выканаўчы камітэт Гродзенскай вобласці
Для дакументаў

ВТ, з. 544, т. 1000 – 03-2024 г.